ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

## КОЖНЫ АДШУКАЎ ТАВАР ПА САБЕ

### Спікеры верхніх палат аглядзелі кірмаш

**Падчас IV Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі адбыўся кірмаш-продаж беларускіх тавараў. Яго наведалі старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл Мясніковіч і старшыня Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі Валянціна Мацвіенка.**

На наступны дзень пасля наведвання Валянціна Мацвіенка прызналася журналістам, што не ўтрымалася і набыла сабе на кірмашы дзве пары абутку беларускага брэнда «Марка», якія ў той жа вечар прымерала і ўпадабала. Яна таксама расказала, што на кірмашы людзі падыходзілі і прасілі, каб падобная кшталту продажы былі арганізаваны часцей. Па словах Міхаіла Мясніковіча, кірмашы не прыносяць вялікага прыбытку для вытворчасцяў і маюць больш выдаткаў, чым даюць прыбытку, але яны маюць іміджавае сацыяльнае значэнне.

Увазе наведвальнікаў быў прапанаваны асартымент тавараў лёгкай прамысловасці і прадуктаў харчавання, якія прадставілі больш за 60 вядучых беларускіх прадпрыемстваў-вытворцаў з усіх рэгіёнаў нашай краіны. На кірмашы можна было паўдзельнічаць у культурна-забаўляльнай праграме, пабачыць выступленне беларускіх ансамбляў, прадэгуставаць мяса-малочную прадукцыю, кандытарскія і хлебабулачныя вырабы. Падчас кірмашу таксама адбыўся шэраг бізнес-сустрэч і дзелавых перагавораў кіраўнікоў прадпрыемстваў і рэгіёнаў Расіі і Беларусі.

## АД ВЫСОКІХ ТЭХНАЛОГІЙ ДА ЗАКАНАДАЎСТВА

### Падчас Форуму рэгіёнаў сенатары паўдзельнічалі ў рабоце секцый

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі выступілі мадэратарамі тэматычных секцый.**

Напрыклад, Ірына Старавойтава, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, мадэрыравала работу секцыі, прысвечанай навукова-тэхнічнаму супрацоўніцтву ў сферы інавацыйнай дзейнасці і высокіх тэхналогій паміж Беларуссю і Расіяй. А Ала Бодак, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, арганізоўвала работу секцыі, прысвечанай гарманізацыі заканадаўства паміж нашымі краінамі.

## НЕ ПАКІНУЛІ БЕЗ УВАГІ

### Члены Савета Рэспублікі ўзялі ўдзел у сесіі Савета дэпутатаў і пасяджэнні выканкама

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Алена Краткова, галоўны ўрач Гродзенскай абласной інфекцыйнай бальніцы, прыняла ўдзел у сесіі Слонімскага раённага Савета дэпутатаў.**

Падчас яе былі разгледжаны пытанні аб эфектыўнасці выкарыстання аб'ектаў нерухомай маёмасці дзяржаўнымі арганізацыямі раённай камунальнай уласнасці і гаспадарчымі таварыствамі з доляй Слонімскага раёна ў статутным фондзе, а таксама захады, якія прымаюцца мясцовымі органамі кіравання па ўключэнні ў гаспадарчы абарот, маёмасці, якая не выкарыстоўваецца.

Акрамя таго, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Васіль Маркевіч, генеральны дырэктар птушкафабрыкі «Дружба», прыняў удзел у пасяджэнні Жамчужненскага сельскага выканаўчага камітэта Баранавіцкага раёна. Былі разгледжаны пытанні арганізацыі на тэрыторыі сельсавета работы па рэалізацыі Дэкрэта Прэзідэнта №18 «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у неўладкаваных сем'ях», а таксама прыняцця грамадзян на ўлік для паляпшэння жыллёвых умоў, выдзялення жылых участкаў для вядзення асабістых падсобных гаспадарак.

НА ВЫШЭЙШЫМ УЗРОЎНІ

# ЗРОБЛЕНА МНОГА. АЛЕ ГЭТАГА МАЛА

### Ключавой падзеяй Форуму рэгіёнаў стала пленарнае пасяджэнне з удзелам кіраўнікоў дзяржаў

**Аснова інтэграцыі — імкненне народаў да яднання. Гэта — першаснае. Мы можам бясконца казаць пра бар'еры і іх знішчэнне, пра недапрацоўкі і дасягненні, але калі ёсць жаданне, ёсць воля людзей працягваць сумесную працу — значыць, нездарма была створана Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі. Пра гэта, а таксама эканамічныя, палітычныя, сацыяльныя і культурныя пытанні ішла гаворка падчас пленарнага пасяджэння IV Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі.**



Фота БЕЛТА.

### За рэгіёнамі — перспектыва інтэграцыі

Па словах Аляксандра Лукашэнка, у тым, што мы супрацоўнічаем з Расіяй, ёсць вялізныя магчымасці і рэсурсы. «І ў гэтым выключна важную ролю іграюць рэгіёны. Падкрэслю — незалежна ад геаграфічнай аддаленасці, усе расійскія рэгіёны для нас блізкія», — сказаў Прэзідэнт Беларусі. «Мы спадзяёмся, што і да беларусаў у Расіі будуць ставіцца сапраўды гэтак, усоды. Пакуль мы праблем у гэтых адносінах не маем. Мы адно аднаго не палохаем, мы ездзем адно да аднаго, як браты, як родныя. І гэта на ўзроўні людзей, а не толькі нашых размоў з высокіх трыбун. Ці гэта пытанні сацыяльных гарантый і правоў грамадзян, ці паставак беларускай тэхнікі, сельскагаспадарчай прадукцыі, навуковых распрацовак, паслуг».

Менавіта такі падыход дазволіць дзвюм дзяржавам не толькі дасягнуць сучаснага ўзроўню тэхналагічнага развіцця, але і — самае галоўнае — захаваць адзінства і ўпэўненасць у заўтрашнім дні. Пры гэтым важнае месца ў развіцці двухбаковага ўзаемадзеяння належыць міжрэгіянальнаму супрацоўніцтву. Аляксандр Лукашэнка дадаў, што правядзенне штогод такіх мерапрыемстваў, як форум, дазваляе падтрымліваць пастаянныя сувязі паміж прадстаўнікамі найвышэйшых і мясцовых органаў улады дзвюх краін. Да цяперашняга моманту дзейнічае 70 пагадненняў на ўзроўні ўрада Беларусі і адміністрацый суб'ектаў Расійскай Федэрацыі. Кожнае з іх суправаджаецца канкрэтнай праграмай мерапрыемстваў на трох-чатырохгадовы перыяд.

Прытым важным пунктам сумеснага росту застаецца сфера высокіх тэхналогій. Кантакты ў ёй, лічыць Прэзідэнт, маглі б развівацца больш дынамічна на тых пляцоўках, якія ўжо даказалі сваю эфектыўнасць. «Напрыклад, на базе шырока вядомага Парка высокіх тэхналогій у Мінску», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што мабільнымі праграмамі кампаній-рэзідэнтаў ПВТ сёння карыстаюцца больш за 1 млрд чалавек у 193 краінах, звыш 90% створанага ў Парку праграмнага забеспячэння ідзе на экспарт у Расію і СНД, краіны Заходняй Еўропы і ЗША.

### Адказаць на тэхналагічныя выклікі

У сваю чаргу Уладзімір Пуцін, Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі, падкрэсліў значнасць супрацоўніцтва ў высокатэхналагічных сферах. Бо сёння фарміруецца новы прамысловы ўклад, заснаваны на актыўным укараненні лічбавых тэхналогій, інавацыйных матэрыялаў, рабатызацыі, «зялёнай» энергетыцы. «І ад таго, як мы з вамі зможам адказаць на гэтыя тэхналагічныя выклікі, будзе залежаць доўгатэрміновая канкурэнтаздольнасць нашых краін, іх пазіцыі ў глабальным падзеле працы. Дазволю сабе нават больш сказаць: ад таго, як мы вырашым гэтую задачу, будзе залежыць — у значнай ступені — наш лёс. Таму трэба нарошчваць нашы намаганні па стварэнні сумесных высокатэхналагічных прамысловых кластараў, інжынірынгавых цэнтраў, выбудоўваць гнуткія кааперацыйныя ланцужкі для вытворчасці навукаёмістай прадукцыі, якая адпавядае самым высокім сусветным стандартам».

Пры гэтым Уладзімір Пуцін падкрэсліў, што Беларусь і Расія валодаюць значнымі кадравымі, інтэлектуальнымі і адукацыйнымі рэсурсамі. А вядучым расійскім і беларускім кампаніям і ўніверсітэтам па сілах распрацоўваць унікальныя тэхналагічныя і праграмныя прадукты, якія маглі б канкурыраваць на сусветных рынках. «Расія гатова да самага цеснага супрацоўніцтва з партнёрамі з Беларусі для забеспячэння ўстойлівага, доўгатэрміновага росту нашых эканомік», — сказаў Прэзідэнт Расіі.

### Не толькі пра дасягненні

У сваю чаргу Міхаіл Мясніковіч, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, нагадаў пра значнасць уніфікацыі, гарманізацыі нацыянальных заканадаўстваў, масавае стварэнне сумесных кампаній, адкрыццё саюзных праграм і праектаў з узаемным допускам суб'ектаў у гэтыя праграмы. «Поспеху ў гэтай справе будуць садзейнічаць абсалютны давер бакоў, захаванне прынцыпаў маральнасці і ўзаемнай павагі», — адзначыў сенатар.

Пры гэтым тут ужо шмат зроблена. Але разам з тым выклікаюць занепакоенасць факты прыняцця прававых актаў у аднабаковым парадку або парушэння правапрымяняльнай практыкі, якія «часта супярэчаць мэтам будаўніцтва Саюзнай дзяржавы і ствараюць няроўныя ўмовы для беларускіх суб'ектаў гаспадарання на адзінай беларуска-расійскай прасторы».

«Прыкладаў нядобрасумленнай канкурэнцыі і неабгрунтаванага бюракратызму нямала. Гаворка не ідзе пра ўступкі і прэферэнцыі для беларускага боку. Але нарматыўна-прававыя акты, якія прымаюцца ў Беларусі і Расіі, павінны рэальна забяспечваць стварэнне і функцыянаванне адзінай эканамічнай прасторы і прававых асноў агульнага рынку, роўных правоў грамадзян», — канстатаваў Міхаіл Мясніковіч.

У сваю чаргу Валянціна Мацвіенка адзначыла, што эфектыўнае супрацоўніцтва Беларусі і Расіі пабудавана па ўсіх магчымых напрамках. «Беларусь — галоўны партнёр Расіі сярод краін СНД, — заявіла яна. — І хоць вынікі першага квартала бягучага года выклікаюць пэўны аптымізм, аднак пакуль сітуацыя застаецца не такой, як хацелася б».

МАНІТОРЫНГУ БЫЦЬ

# ЧАС ВЫПРАБОЎВАЕ ДАКУМЕНТЫ

### Ці будуць унесеныя змены ў Дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы?

**Чацвёрты раз адбылося пасяджэнне міжпарламенцкай камісіі верхніх палат беларускага і расійскага парламента па міжрэгіянальным супрацоўніцтве. Па выніках яго члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі і Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі дамовіліся правесці маніторынг выканання дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі і адпаведнасці яму нацыянальных заканадаўстваў.**

«Мэта гэтага маніторынгу — паглядзець, што выконваецца, што не выконваецца. Бо дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы ні разу не пераглядаўся. За гэты час нешта страціла сваю актуальнасць, штосьці ўжо выконваць не трэба. Гэтыя пункты неабходна ўжо скасаваць. Ці ўключыць нейкія новыя пункты, каб узбагаціць гэты дагавор», — лічыць Мар'яна Шчоткіна, намеснік старшыні Савета Рэспублікі.

Пры гэтым віцэ-спікер адзначыла, што казаць пра тое, што ў дагавор могуць быць унесены змены, заўчасна: «Давайце казаць пра тое, што магчымая выпрацоўка прапаноў па карэкціроўцы, якія будуць пакладзены ў аснову далейшай працы», — сказала яна. Маніторынг плануецца правесці сумесна з Пастаянным камітэтам Саюзнай дзяржавы.

Акрамя таго, на пасяджэнні быў разгледжаны вынік экспертызы нацыянальных заканадаўстваў Беларусі і Расіі ў галіне правядзення скаардынаванай прамысловай палітыкі. Былі выяўлены не толькі праблемы, але і шляхі іх вырашэння.

Пакуль пасяджэнні міжпарламенцкай камісіі праходзяць раз на год падчас Форуму рэгіёнаў, аднак не выключана, што ў далейшым такія сустрэчы будуць адбывацца часцей.

Матэрыялы падрыхтавала Вераніка ПУСТАВІТ. pustavit@zviazda.by